**Аляксандр Сімакоў: Протаіерэй Мікалай Грынкевіч: «зямляцкае» акружэнне ў Сан-Францыска, неапублікаваныя дакументы, новыя звесткі пра позні перыяд жыцця**

*Анатацыя:* Ураджэнец Гомельшчыны Мікалай Грынкевіч, святар, таямніца канца жыцця якога не раскрытая, разглядаецца тут у аспектах зямляцкіх сувязей (асобы, звязныя з Магілёўскай і суседнімі губернямі), праблем антрапанімікі, высвятлення падзей апошняга года ў Сан-Францыска і позніх гадоў жыцця, самыя апошнія звесткі пра якія атрыманы ў 2021 г. Упершыню публікуюцца цалкам фармулярны спіс 1907 г. і паведамленне з пералікам вучняў і настаўнікаў пры пачатку заняткаў у царкоўнай школе ў 1888 г. Акцэнтуецца ўвага на неразгаданых момантах і новых тэматычных узаемасувязях.

**Ключавыя словы:** Зямляцкія матывы ў жыццяпісе, Алеуцкая і Аляскінская епархія, царкоўная школа ў Сан-Францыска, духоўныя вучылішчы (Гомель, Арэнбург, Бялёў), Туркестанская епархія.

Мікалая Сцяпанавіча Грынкевіча яшчэ няма ў беларускіх універсальных і галіновых энцыклапедыях, пра яго не было асобнага артыкула ў «Православной энциклопедии», але толькі з-за недахопу інфармацыі пра яго на час выхаду адпаведных даведачных выданняў. Наяўныя цяпер звесткі сведчаць пра значнасць асобы гэтага, найперш, педагога, які ўнёс дастаткова прыкметны ўклад у сацыяльную і духоўную гісторыю, пра што можна меркаваць і па пробных артыкулах у нашым праекце яго персанальнай энцыклапедыі[1].

Біяграфія Мікалая Грынкевіча ўпісваецца нават у авантурны жанр, эпізоды яе можна было б сустрэць у новых (гіпатэтычных) кнігах з серыі «Палымяныя рэвалюцыянеры» і дапрацаваных версіях даведніка «Рэпрэсаваныя праваслаўныя свяшчэнна- і царкоўнаслужыцелі Беларусі» (Л. Маракоў не ўключыў яго ў том з-за адсутнасці звестак – як і ў нас да 2021 г.), дзякуючы блізкаму знаёмству[2] з доктарам

[1] А. Сімакоў, *Матэрыялы да «Грынкевічаўскай энцыклапедыі»,* [в:] А. Ф. Потапов, *Истоки: становление православия и других религиозных общин на Рогачевщине. 4,* Издатель Печенко А. Г., Минск 2014, с. 157-168.

[2] *Doctor Russel about Nikolai Grinkevich.* Trans. from the Rus. by T. Emmons, [у:] *Веснік БІТ,* 2015, 15 сак., № 15.

Руселем і факту яго ссылкі савецкімі органамі. З пісьменнікаў, па розных крытэрыях – праз агульных знаёмых, не дакладныя, але супадзенні ў месцазнаходжанні, розныя акалічнасці, дух і пафас яго жыцця і дзейнасці, – да Грынкевіча, настаўніка геаграфіі прынамсі ў верасні 1888 г., найбольш блізкія М. Булгакаў, Э. Р. Бэраўз, Ж. Верн, Э. Л. Войніч, У. Дзюба, У. Караленка, У. Караткевіч, У. Крастоўскі, Дж. Лондан, М. Ляскоў, Махтумкулі, П. Мельнікаў-Пячэрскі, М. Памялоўскі, Г. Струнская, С. Сцяпняк-Краўчынскі, Г. Сянкевіч, Л. Талстой, М. Твэн, М. Чарнышэўскі, А. Чэхаў, В. Шаламаў.

Постаць Грынкевіча мае і рэгіянальнае значэнне, і міжнароднае. Яго жыццяпіс уцягвае прадстаўнікоў многіх краін і нацыянальнасцей. Сяло Рэпкі як месца нараджэння, якое знаходзім у яго атэстаце[3] і фармулярным спісе[4], прадвызначыла і месца яго навучання ў Гомельскім духоўным вучылішчы (яшчэ да нязначнага аддалення яго ад сабора, палаца і парка – на другі канец вуліцы Мільённай, цяпер Білецкага). Вядомыя версіі фармулярнага спіса, складзеныя і дапоўненыя ў Сан-Францыска, Арэнбургу і Бялёве, але згадваецца і цытуецца ў многіх нашых артыкулах[5] толькі апошняя перад пераходам святара ў іншую ведамасную сістэму – вайсковую (Ташкенцкі кадэцкі корпус).

На працягу вывучэння біяграфіі Грынкевіча мы выкарысталі шэраг неапублікаваных тэкстаў з дзяржаўных архіваў[6]. Два дакументы, якія публікуем цяпер, выпісаны ў РДГА А. А. Баўкалам у сувязі з нашымі запытамі і дасланы ім у электронных

---

[3] *Аттестат (Гринкевич Николай Стефанович)*, Российский государственный исторический архив (РГИА), ф. 277, оп. 1, д. 309, л. 67.

[4] *Формулярный список о службе смотрителя Белевского духовного училища протоиерея Николая Гринкевича. 1903-1907*, РГИА, ф. 796, оп. 436, д. 1939.

[5] А. Сімакоў, *Грынкевічы ад Рагачоўшчыны да Прыамур'я, Аляскі і Нью-Ёрка, [*у:] *Час* (Jackson Heights, NY). 2011, № 9 (май), с. 8; і інш.

[6] А. Сімакоў, *Ён дбаў пра адукацыю дзяцей індзейцаў: айцец Мікалай Грынкевіч у чатырох светах,* [у:] А. Ф. Патапаў, *Вытокі: станаўленне праваслаўя і іншых рэлігійных абшчын на Рагачоўшчыне. Кн. 2.* Рагачоў 2009, с. 143-149; А. В. Сімакоў, *Перспектывы даследавання службы Мікалая Грынкевіча ў Алеуцкай і Аляскінскай епархіі,* [в:] *I Чтения памяти протоиерея Иоанна Григоровича (1792-1852): историка, археографа, археолога: материалы научно-практической конференции, Минск: Минская духовная академия, 17 мая 2017 г.* Издательство Минской духовной академии, Минск 2018, с. 268-279; А. Сімакоў, *У імкненні служыць Алясцы: новае пра Мікалая Грынкевіча,* [у:] А. Патапаў, *Вытокі. Станаўленне праваслаўя і іншых рэлігійных абшчын на Рагачоўшчыне – 3,* Печанко А. Г., Мінск 2012, с. 111-121; і інш.

паведамленнях: фармулярны спіс – 16.10.2009 г., спісы вучняў і настаўнікаў школы – 10.10.2015 г. З іх толькі дакумент па школе мы мелі магчымасць праверыць і выправіць пазней па выяве.

«Зямляцкае акружэнне» Грынкевіча ў Сан-Францыска, якое мы разглядаем, – суседнія з Магілёўскай губерні і адносна блізкія мясцовасці ў іншых частках Беларусі і сумежных краінах.

Магілёўская. Мы можам меркаваць, што нататку «Пра школу»[7] Грынкевіч напісаў у немалой ступені з жадання падтрымаць доктара-земляка М. Руселя[8]. Генеральны консул У. Арцімовіч не быў ураджэнцам, але пра яго карані і сваякоў у Магілёўскай і Гродзенскай губернях сведчыць нават яго прозвішча[9].

Мінская. А. С. Мартыша памылкова звязвалі з Піншчынай з-за блізкасці валынскіх Мульчыц, дзе ён быў настаяцелем. Яго сын Васіль[10] як галоўны праваслаўны капелан польскай арміі неаднаразова бываў на тэрыторыі Заходняй Беларусі, у прыватнасці, у Брэсце і Чаравачыцкім прыходзе каля Кобрына (выявіў А. Л. Ільін (1956-2020), Гродне.

Кіеўская. Сюды пасля Аляскі прыехаў і тут памёр[11] наглядчык школы Я. Алексін[12]. Урач У. Паўліцкі быў з Валынскай губерні, але вучыўся ў Кіеве.

---

[7] [Н. Гринкевич], *[О школе]*, [в:] *Из жизни духовенства*, тип. «Жизни», Лондон 1902, с. 70-71; [Н. Гринкевич], *О школе*, [в:] Е. Е. Лазарев. *Гавайский сенатор и вожди русского православия епископ Владимир и К. П. Победоносцев*, M. Elpidine, libraire-éditeur, Carouge-Genève 1902, с. 57-58; [Н. Гринкевич], *О школе*, [в:] Н. Руссель, *Житие преосвященного Владимира, бывшего епископа Алеутского и Аляскинского, ныне викарного епископа Воронежского*, тип. П. Правдолюбова, Москва [Лондон] 1895, с. 15-16; N. Grinkevitch, *A proposito della scuola*. Trad. dal russo di S. Busatta, [in:] *Веснік БІТ*, 2014, 10 сак., № 14.

[8] *Doctor Russel about Nikolai Grinkevich*. Trans. from the Rus. by T. Emmons, [у:] *Веснік БІТ*, 2015, 15 сак., № 15.

[9] А. Сімакоў, *Тры пасажы з «Прогресса»: доктар Русель, консул Арцімовіч і рускія ў Сан-Францыска*, [у:] *Наша слова*, 2021, 5 мая, с. 7.

[10] А. Симаков, *Антиподы: два выезда за океан Василия Мартыша*, [w:] *Cerkiewny Wiestnik*, 2016, № 2, s. 47-55.

[11] A. Simakoŭ, *Savchenko in Alaska and San Francisco: a Belarusian, Creoles, Tlingit*, [in:] *Journal of the West*, 2020, № 4, p. 68.

[12] А. Сімакоў, *Царкоўная школа ў Сан-Францыска (1888-1892) у асобах*, [w:] *Cerkiewny Wiestnik*, 2018, № 4, s. 47, 49, 56, 57, 60, 62; *Alexine's foul dungeon*, [in:] *San Francisco Chronicle*, 1891, Jul 8, p. 3; *Alexine's*

Смаленская. Вучня з Кадзьяка М. Саўчанку і яго бацьку Д. Саўчанку можна лічыць землякамі «апасродкавана»; Грынкевіч меў справу з сынам земляка – выхадца з Краснага[13], Дзям'янам, нават простым фармальным чынам – як справавод Аляскінскага духоўнага праўлення. Тлінкіт прынамсі па маці, Мікалай прыбыў у Сан-Францыска на параходзе «Берта» 27.08.1888 г. разам з епіскапам Уладзімірам (Сакалоўскім) у ліку 6 хлопчыкаў – «індзейцаў» (3) і «алеутаў».

Чарнігаўская. Радзіма ігумена Георгія (Чудноўскага)[14]. Брат В. і М. Мартышаў, Раман, – святар, пасля пачатку Першай сусветнай вайны – бежанец з Карошчына каля Брэста ў Сосніцы Чарнігаўскай губерні (такім чынам, з Мартышаў ён фізічна найбольш наблізіўся да радзімы Грынкевіча).

Латвія. А. Іосіф (Левін) у тэлеграме обер-пракурору К. П. Пабеданосцаву ў самым пачатку 1891 г.: «Епіскап хоча пасвяціць Грынкевіча ў святары на мой пост». Іераманах просіць спыніць гэты працэс[15]. Левін звязаны з Мітавай (Елгавай) – выпускнік гімназіі. Сябар Левіна, Г. Б. Байданоўскі (Boydonowski – можа быць журналісцкім скажэннем прозвішча Багданоўскі або яўрэйскага прозвішча Кайданоўскі (ад назвы н. п. у Беларусі), сведчыў пра Грынкевіча і яго канкурэнцыю з Левіным[16].

Польшча. У сан-францыскім эпізодзе Польшча ў сучасных межах выступае нават як краіна-лідар: умоўная назва, якая аб'ядноўвае асоб, сабраных новапрызначаным архірэем, які базіраваўся ў Холмскай духоўнай семінарыі, для ўзмацнення епархіі ў Амерыцы, – Холмская група[17]. Супольнасць для пераезду ў Сан-Францыска ўключыла ў першую чаргу ўраджэнцаў і жыхароў Холма, Люблінскай губерні і

---

*pupils,* [in:] *San Francisco Chronicle,* 1891, Jul. 21, p. 7; *It was Corcorani,* [in:] *San Francisco Chronicle,* 1891, Jul. 29, p. 3; *The Alexine trial, [in:] San Francisco Chronicle,* 1891, Jul. 22, p. 3.

[13] А. В. Симаков, *Савченко на Аляске и в Сан-Франциско: белорус, креолы, тлинкиты,* [в:] *Славянский альманах,* 2019, № 3-4, с. 107-133; A. Simakoŭ, *Savchenko in Alaska and San Francisco: a Belarusian, Creoles, Tlingit,* [in:] *Journal of the West,* 2020, № 4, p. 53-69.

[14] А. Симаков, *Американская трагедия монаха с Афона: игумен Георгий (Чудновский) в Сан-Франциско и на Аляске,* [в:] *Cerkiewny Wiestnik,* 2020, № 3, s. 29-42.

[15] *Telegram from Priest Joseph Levin (San Francisco) to Mr. Pobedonostzeff, the Holy Synod (St. Petersburg) [received (illegible) 2, 3 or 5].01.1891,* РГИА, ф. 1574, оп. 2, д. 76, л. 11.

[16] *Father Levine gone,* [in:] *San Francisco Chronicle,* 1892, Jun. 2, p. 7.

[17] А. Сімакоў, *Холмская група: крыніца аптымізму,* [w:] *Cerkiewny Wiestnik,* 2017, № 2, s. 45-62.

Варшавы, а таксама некалькіх сталых на той момант жыхароў сталіцы і іншых губерняў Расійскай імперыі і грэчаскага вострава Афон[18].

Звесткі з паведамлення епіскапа ад 18(30).09.1888 г. аб пачатку заняткаў у школе выкарыстаны намі ў шэрагу артыкулаў[19]. Тэкст не мае загалоўка. У пераліку настаўнікаў прыбраны кропкі, якія парушаюць уніфармізм.

«Учение в Церковной школе открыто было 1[го] Сентября н. ст. (20 Авг.) – после молебна в церкви и приличной случаю беседы. – Ученики разделены ныне по мере подготовки их на три класса:

приготовительный: 1) Николай Савчинко 2) Феодор Серебренников 3) Андрей Кавутк 4) Матфей Агач 5) Николай Павлов 6) Феодор Татаур 7) Николай Киштек 8) Александр Вениаминов 9) Роман Мартыш 10) Петр Димитриев 11) Тихон Сиротин 12) Некрещеный – Колинс;

первый класс:

13) Николай Бельков 14) Евтихий Корнелюк 15) Антон Сонецкий 16) Павел Зайченко;

третий класс:

17) Александр Вана 18) Антон Гумовский 19) Василий Кашеваров 20) Василий Мартыш 21) Борис Левин 22) Александр Бобовский 23) Николай Мартыш.

Учители: 1) Епископ Владимир: Священное Писание и всеобщую историю 2) Игумен Георгий: Св. История и Катихизис 3) Священник Дьяков: Церковный устав и славянский язык 4) Псаломщик Гринкевич: Географию 5) Диакон Мартыш – Св. Писание и Русский язык 6) Диакон Крючков: Математика и славянский язык 7) Диакон Соболев: Священ. Истор. Нов. Зав. и русский язык 8) Аллан: Английский язык 9) Дабович: Английский язык 10) Кедроливанский и 11) Кашеваров в Воскресной школе – Объяснения Евангелия, Апостола и Св. Истории.

---

[18] А. Симаков, *Американская трагедия монаха с Афона: игумен Георгий (Чудновский) в Сан-Франциско и на Аляске,* [в:] *Cerkiewny Wiestnik*, 2020, № 3, s. 29-42.

[19] А. В. Сімакоў, *Аб назве багаслоўскага вучылішча ў Сан-Францыска,* [в:] *III Чтения памяти протоиерея Иоанна Григоровича (1792–1852): историка, археографа, археолога: материалы научно-практической конференции, Минск: Минская духовная академия, 13 июня 2019 г.* Издательство Минской духовной академии, Минск 2021, с. 29-40; А. Сімакоў, *Холмская група: крыніца аптымізму,* [w:] *Cerkiewny Wiestnik*, 2017, № 2, s. 45-62; А. Сімакоў, *Царкоўная школа ў Сан-Францыска (1888-1892) у асобах,* [w:] *Cerkiewny Wiestnik*, 2018, № 4, s. 46-63.

Владимир Епископ Алеутский и Аляскинский

С. Франциско 1888 г. Сентябр. 18 / 30»[20].

Некаторыя з прозвішчаў вучняў маюць варыяцыі з памылкамі ў напісанні не толькі па-англійску, але і па-руску (напрыклад, правільна Савченко, Шеротин, Санецкий). Нам вядомая пакуль толькі адна публікацыя[21], у якой Грынкевіч расказвае пра аднаго са сваіх вучняў. Пры гэтым журналісты скажаюць прозвішчы абодвух. Варыябельнасць, часам анекдатычная, антрапаніміі і ідэнтыфікацыі асабліва паказальная ў выпадку з Какаранінымі-Коркаранам, паўкроўкам або паўкроўкамі. У падрабязным артыкуле[22], у якім школа іранічна абазначаецца як «"educational" department» царквы, Пол называецца спачатку больш-менш традыцыйна «Kokaranin» – як хлопчык, сын рускага і эскімоскі, які прыехаў два гады таму з Мікалаем Бяльковым (Bellkoff). Далей яны ідуць як «Corcoran» і «Bellknob», пасля чаго паўтараецца ранейшы «spelling». Прадстаўнік адказчыка заўважае, што ёсць яшчэ нейкі «Джон Доў». Але з боку істца пацвярджаецца, што экзэмпліфікант «John Doe» адпавядае Какараніну. «Джэймс Коркаран» пры гэтым не з'яўляецца[23], хаця «James Corcoran» і «Kokaranier» у іншай публікацыі згаданыя для пацвярджэння сведчанняў адзін аднаго[24]. Гл. таксама форму «Какараманін» (Paul Kakoramanin)[25].

Адна з нашых здагадак адносна такой разнастайнасці варыянтаў прозвішча – «італьянскага», «нямецкага» і інш. – ініцыятыва ў зносінах з журналістамі самога вучня, гарэзы і жартаўніка, які быў, паводле Грынкевіча, галоўным рухавіком праблем у школе, уключаючы імітаванне галасоў хатніх птушак прама на ўроках[26].

Прымальная форма ў параўнанні з асноўнай сучаснай, Grinkevich, – Greenkevitch, якая сустракаецца ў газетах і даведніках па Сан-Францыска часцей за іншыя, верагодна, – тая, якую «рэкамендавалі» да ўжывання самі Мікалай і Аляксандра

[20] *[Списки учеников (1–23) и учителей (1–11) Церковной школы, Сан-Франциско, 18(30).09.1888],* РГИА, ф. 1574, оп. 2, д. 129, л. 19.

[21] *It was Corcorani,* [in:] *San Francisco Chronicle,* 1891, Jul. 29, p. 3.

[22] *Alexine's foul dungeon,* [in:] *San Francisco Chronicle,* 1891, Jul 8, p. 3.

[23] *Alexine's foul dungeon,* [in:] *San Francisco Chronicle,* 1891, Jul 8, p. 3.

[24] *The Alexine trial,* [in:] *San Francisco Chronicle,* 1891, Jul. 22, p. 3.

[25] *Alexine's pupils,* [in:] *San Francisco Chronicle,* 1891, Jul. 21, p. 7.

[26] *It was Corcorani,* [in:] *San Francisco Chronicle,* 1891, Jul. 29, p. 3.

Грынкевічы. У адрозненні ад формы, якая скажае арыгінальнае прозвішча толькі перспектывай недакладнага вымаўлення «в», – Greenkewitch[27], іншыя дэфармуюць рускае зыходнае «Гринкевич»: Grenkavitch[28], Greencovitch[29].

У верасні 1895 г. Грынкевіч зацверджаны настаяцелем сабора, узведзены ў сан протаіерэя і пачаў выкладаць «ад 3 да 5 урокаў у тыдзень» Закон Божы ў суботняй школе прападобнага Сергія Раданежскага[30], якая кампенсавала хаця б часткова страту духоўнай школы для падрыхтоўкі клірыкаў. Такім чынам, прабыў на гэтых пазіцыях толькі каля аднаго навучальнага і клерыкальнага года 1895 / 96. Пра ад'езд а. Грынкевіча, які чакаўся на тым жа тыдні, пісала ў кароткім паведамленні газета «Сан-Францыска кронікл» 11.10.1896 г. (29.09 ст. ст.), у якім адзначалася «вернасць, з якой ён адміністраваў справы царквы пад кіраўніцтвам епіскапа Мікалая» (Зіёрава), за што «congregation» паднесла яму залаты крыж як «развітальны падарунак». «Фармулярны спіс аб службе наглядчыка Бялёўскага духоўнага вучылішча протаіерэя Мікалая Грынкевіча. 1903-1907» дае найбольш звестак менавіта пра сан-францыскі перыяд (вылучэнне тлустым шрыфтам дат наша):

«Гринкевич Николай Стефанович

Составлен **27 октября 1903.**

Род. **2 февраля 1864**.

Получает жалованья 1560 руб. и за настоятельство при училищной церкви 200 руб.

Обучался в Гомельском ДУ, Могилевской ДС и Санкт-Петербургской ДА, д. ст.

Назначен псаломщиком кафедрального собора Сан-Франциско **1888 февраля 17**.

Занимался преподаванием уроков в Богословском училище при кафедре с **1888 августа 1** до закрытия оного в **1892.**

Делопроизводитель Аляскинского Духовного Правления **1891 января 1**.

---

[27] *Telegram from Priest Joseph Levin (San Francisco) to Mr. Pobedonostzeff, the Holy Synod (St. Petersburg) [received (illegible) 2, 3 or 5].01.1891,* РГИА, ф. 1574, оп. 2, д. 76, л. 11.

[28] *Father Levine gone,* [in:] *San Francisco Chronicle,* 1892, Jun. 2, p. 7.

[29] *It was Corcorani,* [in:] *San Francisco Chronicle,* 1891, Jul. 29, p. 3.

[30] *Формулярный список о службе смотрителя Белевского духовного училища протоиерея Николая Гринкевича. 1903-1907,* РГИА, ф. 796, оп. 436, д. 1939.

Определен священником к кафедральному собору Сан-Франциско **1891 января 3**.

Рукоположен **1891 февраля 3**.

Назначен членом Аляскинского Духовного Правления **1891 февраля 17.**

Награжден набедренником (за усердие по службе) **1891 октября 13**.

Казначей Аляскинского Духовного Правления **1892 февраля 28.**

Золотой наперсный крест из Кабинета ЕИВ применительно к Высочайше утвержденному 1 мая 1820 определению Св. Синода (указ № 1494) **1892 апреля 13** (за 4-летнюю службу в Америке).

За энергию в деле сбора пожертвований в пользу пострадавших от неурожая в России выражена ему Архипастырская признательность **1892 сентября 10.**

За усердные труды по школе и церкви выражена Архипастырская благодарность **1893 мая 12.**

Скуфья **1893 сентября 12.**

Командирован на 3 месяца на Всемирную выставку в Чикаго для сбора пожертвований с **1893 сентября 26** по **1893 декабря 20**.

Переведен на протоиерейскую вакансию и. д. настоятеля кафедрального собора с обязательством вести казначейскую часть и часть делопроизводства без особого вознаграждения **1894 февраля 10**.

Вместо камилавки, к которой был представлен, преподано благословение Св. Синода **1894 мая 15**.

Утвержден настоятелем кафедрального собора **1895 сентября 23**.

Возведен в сан протоиерея **1895 сентября 25.**

Преподавал Закон Божий в субботней школе преподобного Сер. с **25 сентября 1895** от 3 до 5 уроков в неделю.

Утвержден в степени кандидата богословия **1896 июня 8**.

Уволен от службы в Алеутской епархии **1896 августа 1**.

Определением Св. Синода назначен смотрителем Оренбургского ДУ **1896 ноября 22.**

Назначен настоятелем церкви св. Феодора при ДУ **1897 марта 7**.

Состоял членом Комиссии по обсуждению дела о соединении 3 окружных церковно-свечных заводов Оренбургской епархии в один епархиальный **1897 марта 14**.

Камилавка **1898 мая 6.**

Окружным Духовно-Училищным съездом избран членом от правления Духовного Училища в строительную по постройке нового корпуса Оренбургского ДУ комиссию **1899 сентября 2**.

Производил следствие по делу благочинного 1 округа Оренбургской епархии **1899 июля 6**.

Назначен членом от духовенства в Комитет по управлению благотворительного учреждения С. и М. Ивановых в Оренбурге **1899 октября 29**.

Состоял членом комиссии для произведения испытаний лицам, кои, не получив полного семинарского и училищного образования, пожелали бы получить какую-либо священную должность в Оренбургской епархии с **5 ноября 1899** по **1 августа 1903**.

Орден св. Анны 3 ст. **1901 мая 6.**

Определением Св. Синода **23 августа 1903** № 7640 переведен смотрителем Белевского ДУ.

Определен настоятелем церкви св. Кукши при Белевском ДУ **1903 сентября 23**.

Послужной список **25 октября 1904**.

Жалованье по должности смотрителя за 2% вычетом 1528 руб. 80 коп.

Утвержден в должности постоянного члена Белевского Уездного отделения Тульского Епархиального Совета **1904 июля 23**.

Послужной список **27 октября 1905**.

Жалованье 1560 руб. по должности смотрителя и за настоятельство при училищной церкви 115 руб.

Послужной список **24 октября 1906**.

Жалованье с 2% вычетом 1528 руб. 80 коп. и за служение в училищной церкви 100 руб.

Послужной список **25 октября 1907**.

Жалованье с 2% вычетом 1528 руб. 80 коп. и за служение в училищной церкви 215 руб.

Благословение Св. Синода с грамотой **1907 мая 6**.

В отпуске был **6 июля – 6 августа 1898, 1-17 января 1901, 19 июля – 3 августа 1903, 12-19 июня 1906, 20-31 июля 1907**.

В семье у него: жена Александра Павловна, дочь протоиерея, дети: Сергей, род. **19 марта 1900**, Валентин, род. **26 июля 1906»**[31].

Кара-калінскі эпізод[32], які стаў нам вядомы дзякуючы мадэратару сайта «Туркестанская Галгофа», прафесару ПСЦГУ К. Я. Азміцель у маі 2021 г. (яе электроннае паведамленне ад 18.05.2021), важны ў сувязі з нашым жаданнем паведамляць пра пошукі даты і месца смерці протаіерэя Грынкевіча. Непасрэдная прычына для пераезду Грынкевіча з Ташкента ў с. або пас. (аул) Кара-Кала на туркменска-іранскім памежжы становіцца яснай з ліста абнаўленчага епіскапа Мікалая (Аляксеевіча, гл. пра святара Віктара Коблава з такім жа імем па бацьку ў арэнбургскім лёсе Грынкевіча[33]) Коблава ў ДПУ[34] (крыніца тэксту дакумента – электроннае паведамленне К. Я. Азміцель ад 20.07.2021).

Грынкевіч быў дастаткова блізкі са славутым уладыкам (з каранямі ў Магілёўскай губерні) Лукой (Война-Ясянецкім). Іх імёны сустракаюцца на адной старонцы дакумента, у якім настаяцель Сергіеўскай царквы Грынкевіч 1.03.1927 г. (самая позняя вядомая нам дата яго жыцця) пацвердзіў запісы пра службу протаіерэя Д.

[31] *Формулярный список о службе смотрителя Белевского духовного училища протоиерея Николая Гринкевича. 1903-1907,* РГИА, ф. 796, оп. 436, д. 1939.

[32] *Письма епископа Иннокентия из Кара-Кала (Туркмения). Апрель 1924 года*, [в:] С. А. Зегжда, *Александро-Невское братство: добрым примером, житием и словом*, Новости мира, [Набережные Челны] 2009, с. 106, 107-108, 115, 119; А. Симаков, *Заметка Николая Гринкевича «О школе» и дополняющие ее тексты*, [w:] *ΕΛΠΙΣ [Elpis]*, 2021, № 23, s. 94; А. Сімакоў, *Рыбак на Сумбары, або Айцец Грынкевіч зноў сустрэўся з гваюлай? Мітрафорны протаіерэй у туркменскім ауле,* [у:] *Наша слова*, 2021, 5 жн., с. 7.

[33] О. В. Никифорова, *Архиепископ Владимир (Соколовский): последний настоятель московского Спасо-Андроникова монастыря*, Переход, Москва 2014, с. 185, 214.

[34] А. Сімакоў, *Рыбак на Сумбары, або Айцец Грынкевіч зноў сустрэўся з гваюлай? Мітрафорны протаіерэй у туркменскім ауле,* [у:] *Наша слова*, 2021, 5 жн., с. 7.

Цярпігорава перад пераводам апошняга ў аднайменную царкву ў Самаркандзе[35] (крыніца выявы дакумента – электроннае паведамленне К. Я. Азміцель ад 28.09.2021).

У Грынкевіча было шмат братоў, іншых сваякоў і цёзак па прозвішчы з духоўнага саслоўя, якія вучыліся ў ГДВ і / або служылі ў розных паветах у Беларусі. «Разрядный список воспитанников Могилевской духовной семинарии, составленный в педагогическом собрании Правления 16-го Июня 1884 года, после бывших годичных испытаний», апублікаваны ў «Могилевских епархиальных ведомостях», уключае імёны пяці Грынкевічаў, што адначасова вучыліся ў МагДС і былі пераведзены ў наступныя класы або скончылі яе: Аляксандр (2-гі клас), Фёдар (3), Павел (4), Дзмітрый (6), Мікалай (6). З іх мы не ведаем толькі імя па бацьку Паўла, а Аляксандр і Фёдар – Сцяпанавічы і верагодныя родныя браты Мікалая і Дзмітрыя Грынкевічаў. У Аляксандра асабліва вялікі спіс перамяшчэнняў па службе за параўнальна невялікі час (паводле «Памятнай кніжкі» губерні): Бабінавічы (радзіма сяброўкі і суаўтара Дж. Лондана Г. Струнскай) Аршанскага, Батунь і Бахань (родная вёска дзеда аўтара паведамлення ў Слаўгарадскім раёне, нежылая пасля аварыі на ЧАЭС) Быхаўскага, Восава Чэрыкаўскага, Заселле Клімавіцкага, Кулікова Мсціслаўскага, Плешчыцы Чавускага паветаў, Шклоў. У Заселлі (цяпер Шумяцкі раён Смаленскай вобласці) – яго апошняе вядомае месца службы перад рэвалюцыямі 1917 г., у той час як у Фёдара Сцяпанавіча – Горкі: судовы прыстаў Горацкага павета (у «…кніжках» з 1907 па 1916 г.; калі ён стаў прыставам, указвалася адукацыя: «дух. сем.» або «восп. в дух. сем.»).

Мала даследаваны сувязі Грынкевічаў, з якіх паходзіў У. Караткевіч, з іншымі грынкевічаўскімі галінамі. Сем'і бацькі Мікалая Сцяпана Фёдаравіча і прадзеда Караткевіча Ульяна Мікалаевіча перакрыжоўваюцца на Рагачоўшчыне. Фёдар і імя па бацьку ад яго ў пошуках па святарскіх сем'ях Грынкевічаў даюць мала вынікаў, у той час як Сцяпан – шмат. Напрыклад, Грынкевіч Ганна Сцяпанаўна – гэта стрыечная сястра маці Караткевіча. Адным з самых паўднёвых з месцаў службы Грынкевічаў была царква ў вёсцы Жалезнікі Гомельскага павета (Веткаўскі раён) – Стафан.

[35] *Послужной список прот. Дмитрия Терпигорева,* Центральный государственный архив Республики Узбекистан (ЦГА РУз), ф. Р-429, оп. 1, д. 28, л. 2.

З многімі Грынкевічамі Магілёўшчыны, Віцебшчыны і Гомельшчыны, уключаючы брата Дзмітрыя, які пазней загадкава «знік» у Благавешчанску[36], Мікалай мог весці перапіску са звесткамі па «каліфарніяне» – г.зн. у перыяд яго жыцця ў Сан-Францыска. Вялікі рамантычны патэнцыял маюць падрабязнасці гісторыі ранняй смерці і знікнення прозвішча прадстаўнікоў сям'і жонкі Грынкевіча – Кедраліванскіх, асабліва Элізабет (Лізаветы), выкладчыка-філолага і аўтара дысертацыі «Прырода камедыі як праверaная камедыйнымі канцоўкамі» (Берклі, 1910).

Загадкі і разгадкі, звязаныя з вучнямі і калегамі-сувыхавальнікамі Грынкевіча, можна праілюстраваць прыкладамі, знойдзенымі параўнальна нядаўна. В. Мартыш перакрыжоўваецца на Валдаі з «нязменным» дырэктарам 2-й жаночай гімназіі з Сасноўца Мікалаем Мартышам – абодва ў бежанстве з гэтага горада ў Дамброўскім басейне. Хаця вядома, што «сан-францыскі» Мікалай Мартыш да і пасля Першай сусветнай вайны працаваў як законнік у розных месцах паўднёва-ўсходняй і паўднёва-цэнтральнай Польшчы, гэта не выключае змены характару яго заняткаў на педагагічны і лёсу бежанца. У 1937 г. ён выйшаў на пенсію з пасады віцэ-старшыні Акруговага суда ў Варшаве і прызначаны іпатэчным пісарам пры іпатэчным аддзеле Акруговага суда ў Кельцах; пасля заняцца Кельцаў Чырвонай Арміяй арыштоўваўся ў складзе групы юрыстаў СМЕРШам, але быў вызвалены; працягваў там займацца юрыдычнай практыкай і ў 1952 г.

Фігура Мікалая Грынкевіча арганічна ўпісалася ў навуковыя інтарэсы аўтара і як адзін з нямногіх прыкладаў працяглых кантактаў з карэннымі жыхарамі Амерыкі ў камернай прасторы – у рамках школьнага працэсу. Менавіта школы далі найбольш цікавы матэрыял па прамых беларуска-індзейскіх кантактах. Цікава параўнаць, хто з беларусаў быў педагогам індзейцаў у тым жа 19 ст. На Алясцы гэта Д. Транчук, К. Баброўскі, Ф. Петрашкевіч[37]. Кіраўнік Мэрылендскай місіі езуітаў Ф. Дзеражынскі апісаў наведванне ім летам 1827 г. «індзейскай семінарыі» (імя св. Рэжы – першая ў ЗША каталіцкая навучальная ўстанова для атрымання індзейцамі вышэйшай адукацыі) у штаце Місуры (Флорысант), на адкрыццё якой сам даваў згоду, – сярод

---

[36] А. Сімакоў, *Грынкевічы ад Рагачоўшчыны да Прыамур'я, Аляскі і Нью-Ёрка, [*у:] *Час* (Jackson Heights, NY). 2011, № 9 (май), с. 8.

[37] А. В. Симаков, *Савченко на Аляске и в Сан-Франциско: белорус, креолы, тлинкиты,* [в:] *Славянский альманах,* 2019, № 3-4, с. 118-119; А. Simakoŭ, *Savchenko in Alaska and San Francisco: a Belarusian, Creoles, Tlingit, [*in:] *Journal of the West,* 2020, № 4, p. 66.

вучняў былі сокі, аявы, а большасць – оседжы, якія асацыіруюцца з класічнымі прэрыйнымі індзейцамі.

**Бібліяграфія:**

**Літаратура:**

*Alexine's foul dungeon,* [in:] *San Francisco Chronicle,* 1891, Jul 8, p. 3.

*Alexine's pupils,* [in:] *San Francisco Chronicle,* 1891, Jul. 21, p. 7.

*Doctor Russel about Nikolai Grinkevich.* Trans. from the Rus. by T. Emmons, [у:] *Веснік БІТ,* 2015, 15 сак., № 15.

*Father Levine gone,* [in:] *San Francisco Chronicle,* 1892, Jun. 2, p. 7.

*It was Corcorani*, [in:] *San Francisco Chronicle,* 1891, Jul. 29, p. 3.

Grinkevitch N., *A proposito della scuola.* Trad. dal russo di S. Busatta, [in:] *Веснік БІТ*, 2014, 10 сак., № 14.

Simakoŭ A., *Savchenko in Alaska and San Francisco: a Belarusian, Creoles, Tlingit,* [in:] *Journal of the West.* 2020, № 4, p. 53-69.

*The Alexine trial, [in:] San Francisco Chronicle*, 1891, Jul. 22, p. 3.

[Гринкевич Н.], *[О школе],* [в:] *Из жизни духовенства*, тип. «Жизни», Лондон 1902, с. 70-71.

[Гринкевич Н.], *О школе,* [в:] Лазарев Е. Е. *Гавайский сенатор и вожди русского православия епископ Владимир и К. П. Победоносцев*, M. Elpidine, libraire-éditeur, Carouge-Genève 1902, с. 57-58.

[Гринкевич Н.], *О школе,* [в:] Руссель Н., *Житие преосвященного Владимира, бывшего епископа Алеутского и Аляскинского, ныне викарного епископа Воронежского*, тип. П. Правдолюбова, Москва [Лондон] 1895, с. 15-16.

Никифорова О. В., *Архиепископ Владимир (Соколовский): последний настоятель московского Спасо-Андроникова монастыря*, Переход, Москва 2014.

*Письма епископа Иннокентия из Кара-Кала (Туркмения). Апрель 1924 года*, [в:] Зегжда С. А., *Александро-Невское братство: добрым примером, житием и словом*, Новости мира, [Набережные Челны] 2009, с. 101-121.

Симаков А., *Американская трагедия монаха с Афона: игумен Георгий (Чудновский) в Сан-Франциско и на Аляске,* [в:] *Cerkiewny Wiestnik*, 2020, № 3, s. 29-42.

Симаков А., *Антиподы: два выезда за океан Василия Мартыша,* [w:] *Cerkiewny Wiestnik*, 2016, № 2, s. 47-55.

Симаков А., *Заметка Николая Гринкевича «О школе» и дополняющие ее тексты*, [w:] *ΕΛΠΙΣ [Elpis],* 2021, № 23, s. 89-95.

Симаков А. В., *Савченко на Аляске и в Сан-Франциско: белорус, креолы, тлинкиты,* [в:] *Славянский альманах,* 2019, № 3-4, с. 107-133.

Сімакоў А. В., *Аб назве багаслоўскага вучылішча ў Сан-Францыска,* [в:] *III Чтения памяти протоиерея Иоанна Григоровича (1792–1852): историка, археографа, археолога: материалы научно-практической конференции, Минск: Минская духовная академия, 13 июня 2019 г.* Издательство Минской духовной академии, Минск 2021, с. 29-40.

Сімакоў А., *Грынкевічы ад Рагачоўшчыны да Прыамур'я, Аляскі і Нью-Ёрка, [*у:] *Час* (Jackson Heights, NY). 2011, № 9 (май), с. 8.

Сімакоў А., *Ён дбаў пра адукацыю дзяцей індзейцаў: айцец Мікалай Грынкевіч у чатырох светах,* [у:] *Патапаў А. Ф. Вытокі: станаўленне праваслаўя і іншых рэлігійных абшчын на Рагачоўшчыне. Кн. 2.* Рагачоў 2009, с. 143-149.

Сімакоў А., *Матэрыялы да «Грынкевічаўскай энцыклапедыі»,* [в:] Потапов А. Ф., *Истоки: становление православия и других религиозных общин на Рогачевщине. 4*, Издатель Печенко А. Г., Минск 2014, с. 157-168.

Сімакоў А. В., *Перспектывы даследавання службы Мікалая Грынкевіча ў Алеуцкай і Аляскінскай епархіі*, [в:] *I Чтения памяти протоиерея Иоанна Григоровича (1792-1852): историка, археографа, археолога: материалы научно-практической конференции, Минск: Минская духовная академия, 17 мая 2017 г.* Издательство Минской духовной академии, Минск 2018, с. 268-279.

Сімакоў А., *Рыбак на Сумбары, або Айцец Грынкевіч зноў сустрэўся з гваюлай? Мітрафорны протаіерэй у туркменскім ауле,* [у:] *Наша слова*, 2021, 5 жн., с. 7.

Сімакоў А., *Тры пасажы з «Прогресса»: доктар Русель, консул Арцімовіч і рускія ў Сан-Францыска,* [у:] *Наша слова,* 2021, 5 мая, с. 7.

Сімакоў А., *У імкненні служыць Аляcцы: новае пра Мікалая Грынкевіча,* [у:] Патапаў, А. *Вытокі. Станаўленне праваслаўя і іншых рэлігійных абшчын на Рагачоўшчыне – 3,* Печанко А. Г., Мінск 2012, с. 111-121.

Сімакоў А., *Холмская група: крыніца аптымізму,* [w:] *Cerkiewny Wiestnik*, 2017, № 2, s. 45-62.

Сімакоў А., *Царкоўная школа ў Сан-Францыска (1888-1892) у асобах,* [w:] *Cerkiewny Wiestnik*, 2018, № 4, s. 46-63.

**Архіўныя крыніцы:**

*Telegram from Priest Joseph Levin (San Francisco) to Mr. Pobedonostzeff, the Holy Synod (St. Petersburg) [received (illegible) 2, 3 or 5].01.1891,* РГИА, ф. 1574, оп. 2, д. 76, л. 11.

*Аттестат (Гринкевич Николай Стефанович),* Российский государственный исторический архив (РГИА), ф. 277, оп. 1, д. 309, л. 67.

*Послужной список прот. Дмитрия Терпигорева,* Центральный государственный архив Республики Узбекистан (ЦГА РУз), ф. Р-429, оп. 1, д. 28, л. 1-2.

*[Списки учеников (1–23) и учителей (1–11) Церковной школы, Сан-Франциско, 18(30).09.1888],* РГИА, ф. 1574, оп. 2, д. 129, л. 19.

*Формулярный список о службе смотрителя Белевского духовного училища протоиерея Николая Гринкевича. 1903-1907,* РГИА, ф. 796, оп. 436, д. 1939.

**Aliaksandr Simakou: Archpriest Nikolai Grinkevich: the «compatriot» environment in San Francisco, unpublished documents, new information about the late period of life** ***(webzine "Kultura.Natsyja", issue 31, April 2023, 135-150,*** **[www.sakavik.net](www.sakavik.net)** ***)***

Abstract**:** A native of Gomel Voblasts, Nikolai Grinkevich, a priest with the unrevealed mystery of the end of his life, is considered here in the aspects of his compatriot ties (persons connected with the Mogilev and neighboring provinces), problems of anthroponymics, clarification of the events of the last year in San Francisco and his later years, the most recent information about which was received in 2021. The formulary list of 1907 and the memorandum listing the students and teachers at the beginning of classes at the church school in 1888 are published for the first time completely. The emphasis is on unsolved moments and new thematic connections.

**Александр Симаков: Протоиерей Николай Гринкевич: «землячья» среда в Сан-Франциско, неопубликованные документы, новые сведения о позднем периоде жизни**

***(веб-журнал "Культура. Нация", вып. 31, апрель 2023, 135-150, www.sakavik.net )***

*Аннотация*: Уроженец Гомельской области Николай Гринкевич, священник с нераскрытой тайной конца жизни, рассматривается здесь в аспектах его землячеcких связей (лиц, связанных с Могилевской и соседними губерниями), проблем антропонимики, уточнения событий последнего года в Сан-Франциско и последних его лет, самые свежие сведения о которых получены в 2021 г. Формулярный список 1907 г. и меморандум списков учеников и учителей к началу занятий в церковной школе в 1888 г. публикуются впервые полностью. Акцент делается на нерешенных моментах и новых тематических связях.